# ПРА ВЕРНАГА ЛЕНІНЦА

Высокі лоб, уважлівы позірк праніклівых вачэй, невялікія чарнявыя вусікі — ва ўсім абліччы гэтага чалавека была нейкая асаблівая прывабнасць, шчырасць, прыхільнасць і дабрата. У яго асобе прыроджаная сялянская мудрасць арганічна дапаўнялася грунтоўнай асветай і шырынёю погляду на жыццё і грамадскія падзеі інтэлігента, што выйшаў з народных глыбінь. Такім ведала Аляксандра Рыгоравіча Чарвякова ў свой час уся Беларусь. Ведала як выдатнага палітычнага дзеяча, ведала проста як чалавека і камуніста ленінскай гвардыі, які ўмеў арганізаваць народ, заўсёды ішоў з народам, верна служыў народу.

Пра гэта ідзе гаворка ў цікавай і змястоўнай кнізе Уладзіміра Якутава «А. Р. Чарвякоў. Старонкі біяграфіі», што выйшла нядаўна ў выдавецтве «Беларусь». Аўтар нарыса ярка і жыва, на багатым фактычным матэрыяле паказвае нялёгкія жыццёвыя пуцявіны Чарвякова ў дарэвалюцыйны час, а таксама яго бурлівую дзейнасць вернага ленінца пасля Кастрычніка.

Беларускі хлопец з вёскі Дукорка, што на Ігуменшчыне, змалку трапіў у вялікі горад: бацька ў пошуках лепшай долі пераехаў з сям'ёй ў Вільню. Там была вучоба ў гарадскім двухкласным вучылішчы, потым праца чорнарабочым, служба пісарчуком, нялёгкі рэпетытарскі хлеб. Працалюбівы і здольны да вучобы юнак многа чытаў, займаўся самастойна і нарэшце здаў экстэрнам экзамен на званне народнага настаўніка, працаваў у пачатковай школе, а пасля вучыўся ў Віленскім настаўніцкім інстытуце. Закончыў ён вучобу ў інстытуце ў 1915 годзе, і неўзабаве пачалася ваенная муштра ў Аляксандраўскім ваенным вучылішчы (дарэчы, цікавы факт: у вучылішчы знаходзіўся тады і Якуб Колас; закончыў, праўда, ён вучылішча на месяц раней, чым А. Чарвякоў).

Лютаўскую рэвалюцыю прапаршчык Чарвякоў сустрэў у сталічным Пецярбургу, прыняў ў ёй актыўны ўдзел, а ў маі 1917 года ён, камандзір роты другога кулямётнага палка, стаў членам Камуністычнай партыі.

Прыцягваючы і ўмела выкарыстоўваючы разнастайныя звесткі і дакументальныя факты, успаміны самога Аляксандра Рыгоравіча, архіўныя матэрыялы, скупую інфармацыю тагачаснай перыёдыкі, Уладзімір Якутаў узнаўляе перад намі жывую карціну далёкіх, але незабыўных падзей першых год Савецкай улады і ўтварэння беларускай дзяржаўнасці. Усюды тут на пярэднім краі барацьбы А. Чарвякоў — палымяны прапагандыст і арганізатар народных мас.

З іменем А. Чарвякова звязана дзейнасць Беларускага нацыянальнага камісарыята — першай савецкай установы, якая займалася праблемамі беларускай дзяржаўнасці і культурна-асветнымі пытаннямі. Белнацком, першым камісарам якога быў А. Чарвякоў, наладзіў выданне кніг на актуальныя тэмы, першай беларускай савецкай газеты «Дзянніца», адкрыў Беларускі народны універсітэт у Маскве, беларускія школы, займаўся дапамогай бежанцам-беларусам.

Пазней беларускі камуніст атрымлівае прызначэнне камісарам дывізіі, працуе на адказнай пасадзе начальніка культурна-асветнага аддзела Усерасійскага бюро ваенных камісараў, восенню 1918 года ўпершыню сустракаецца з У. І. Леніным.

Далей аўтар кнігі вядзе свайго героя праз тыя памятныя падзеі, якія сталі слаўнай гісторыяй нашай рэспублікі. Знаходзячыся ў Маскве, А. Чарвякоў прымае актыўны ўдзел у мерапрыемствах і захадах партыі і ўрада, звязаных з падрыхтоўкай да аб'яўлення Савецкай Беларусі. Ён рэдагуе тэкст вядомага Маніфеста, напісанага З. Жылуновічам (Цішкам Гартным), едзе ў Смаленск на шостую абласную партыйную канферэнцыю. Там, у Смаленску, 1 студзеня

Сцяпан АЛЕКСАНДРОВІЧ.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы